Праект

ДЭКЛЯРАЦЫЯ КАМІТЭТУ "58"

-- Беларускага грамадскага гісторыка-асьветніцкага таварыства памяці ахвяр сталінізму

Сталінізм, як антычалавечы дзяржаўна-палітычны рэжым, тэорыя і практыка, нанёс велізарную шкоду нашаму народу.

Сотні тысяч яго сыноў былі закатаваныя ў сталінскіх засьценках, расстраляныя ў месцах масавых забойстваў, памерлі ад непасільнай рабскай працы, ад голаду, холаду і хвароб у канцлагерах.

Сталінскі рэжым прымусова выселіў сотні тысяч жыхароў нашай рэспублікі ў сібірскую тайгу, на крайнюю поўнач, у казахстанскія стэпы, дзе яны былі асуджаныя на выміраньне або асіміляцыю.

Сталінскія рэпрэсіі на працягу 20-х -- пачатку 50-х гадоў хвалямі перакочваліся па краіне, вынішчалі ўсё лепшае, актыўнае, разумнае, творчае.

Сталіністамі былі вынішчаны ленінскія кадры камуністычнай партыі, найбольш кваліфікаваныя, сумленныя савецкія, дзяржаўныя і гаспадарчыя работнікі.

Сталіністамі была вынішчана самая працавітая і прадпрымальная частка нашага сялянства, што генетычна фармавалася на працягу многіх сотняў пакаленьняў. Рэшту сельскага насельніцтва дэмаралізавалі страхам фізічнага зьнішчэньня, прыгоннай працай, хлусьнёй.

Сталіністамі была вынішчана большая частка сьвядомай беларускай інтэлігенцыі -- пісьменнікаў, вучоных, іншых творчых работнікаў, што складалі цьвет нацыі. Праводзілася разбурэньне нашай гістарычнай і культурнай спадчыны, выцясненьне роднай мовы з усіх сфер грамадскага ўжытку, чым быў зроблены замах на само існаваньне беларускага народа, як этнічнай асобнасьці.

Серп сталінскага беззаконьня не літаваў ні маршала і акадэміка,

ні простага рабочага і непісьменнага селяніна, ні старых, ні жанчын, ні дзяцей. Мала на Беларусі сем"яў, якіх бы не закрануў сваім чорным крылом сталінскі генацыд.

За 20-е стагодзьдзе некаторыя суседнія народы - рускія, палякі, якія, як і мы, перажылі спусташэньні двух сусветных войнаў, колькасна значна павялічыліся. Беларусы ж падыходзяць да канца стагодзьдзя практычна з тым жа, з чым і пачыналі яго /нават з меншым/. Дзе ж тыя мільёны, на якіх нас павінна было паболець? Яны, перш за ўсё, на крывавым сумленьні сталіністаў.

Імкнучыся да татальнай уніфікацыі, сталіністы душылі самабытнасьць усіх нацыянальных груп насельніцтва, што пражываюць у БССР, вынішчалі іх інтэлігенцыю. Сталінізм сцьвердзіў сябе як антычалавечая, антынародная зьява. Злачынствы сталінізму -- гэта злачынствы супроць чалавецтва. Гэтым злачынствам, якімі б лозунгамі іх не прыкрывалі, не павінна быць тэрміну даўнасьці.

Наш зварот да трагічных старонак мінулага прадыктаваны адным сьвятым жаданьнем: садзейнічаць выяўленьню поўнай і праўдзівай карціны масавых забойстваў, рэпрэсій і тэрору на Беларусі, каб узбудзіць сумленьне народа, вярнуць яму праўду, павагу і справядлівасьць і тым самым прадухіліць у будучым паўтарэньне такіх трагедый, вынішчэньне нацыі і зневажэньне людзей.

Камітэт "58" ставіць задачы:

Высьветліць паіменна колькасьць людзей, што загінулі ў час сталінскага генацыду 1920-х -- пачатку 1950-х гадоў на Беларусі у межах дзяржаўнай, гістарычнай і этнічнай тэрыторыі народа -- усюды, дзе жыве беларускае насельніцтва.

Вызначыць месцы забойстваў і пахаваньняў ахвяр.

Садзейнічаць стварэньню мартыралогіі насельніцтва Беларусі, пацярпелага ад забойстваў, незаконных рэпрэсій і вынішчэньня ў перыяд сталіншчыны.

Высьветліць прозьвішчы арганізатараў і выканаўцаў масавых забойстваў, рэпрэсій і тэрору. Паставіць пытаньне аб правядзеньні сьледства і суда над імі.

Патрабаваць усесаюзнага і міжнароднага суда над Іосіфам Сталіным і яго акружэньнем, над сталінізмам як антычалавечай дзяржаўна-палітычнай сістэмай, ідэалогіяй, тэорыяй і практыкай.

Дабівацца адпаведных дапаўненьняў Канстытуцыі і Крымінальнага кодэксу БССР аб адказнасьці за злачынствы сталіншчыны, за прапаганду сталінізму, аб нераспаўсюджаньні на гэтыя злачынствы тэрміну даўнасьці.

Стварыць у горадзе Менску навукова-дасьледчы, асьветніцкі, архітэктурна-мемарыяльны комплекс "МАРТЫРАЛОГ БЕЛАРУСІ" памяці ахвяр сталінізму. У Мартыралог, акрамя помнікаў і абеліскаў па усёй Беларусі ў месцах пахаваньня замучаных і забітых, павінны ўвайсьці: Мемарыяльны комплекс у Курапатах, Інфармацыйна-дасьледчы цэнтр з архівам; музей; бібліятэка.

Хадайнічаць перад Вярхоўным Саветам БССР аб стварэньні "МАРТЫРАЛОГУ БЕЛАРУСІ" і помнікаў ахвярам сталіншчыны на месцах масавых забойстваў і пакут народа.

Адчыніць спецыяльны рахунак у банку, на які можна будзе перасылаць грошы на помнікі і "Мартыралог".

Выдаваць бюлетэнь "Мартыралог", дзе адлюстравана праца Камітэта "58"; будуць друкавацца дакументы, дасьледаваньні і матэрыялы аб злачынствах сталіншчыны.

Садзейнічаць публікацыі ў перыядычным друку зьвестак і артыкулаў аб народнай трагедыі, выпуску кніг, зборнікаў дакументаў, дакументальных фільмаў.

Хадайнічаць перад Прэзідыумам Акадэміі навук БССР аб стварэньні пры Інстытуце гісторыі аддзела па дасьледаваньню сістэмы і злачынстваў сталінізму.

Паставіць пытаньне аб тэрміновай падрыхтоўцы і прыняцьці неабходных заканадаўчых дакументаў па ўтрыманьні архіваў з указаньнем ценау часу /ад 1-га да 30 гадоў/, пасьля якога ўсе закрытыя сховішчы дакументаў і архівы ведамасных, дзяржаўных і грамадскіх установ і ў першую чаргу архівы КДБ - НКУС павінны быць рассакрэчаны, стаць агульнадаступнымі і перададзены ў дзяржаўныя гістарычныя архівы. Дабівацца выданьня указу аб ліквідацыі "спецфондаў", "спецсховішчаў", усіх праяў "арышту" дакументаў, кніг і перыядычных выданьняў.

Паставіць пытаньне аб строгай справаздачнасьці КДБ і МУС перад Вярхоўнымі Саветамі рэспублік і Вярхоўным Саветам СССР.

Дабівацца ад дзяржаўных органаў правядзеньня спрыяльнай сацыяльнай палітыкі ў дачыненьні да пацярпелых ад сталінскага рэпрэсіўна-тэрарыстычнага рэжыму, да непрацаздольных асоб з сем"яў замучаных і забітых /спецыяльныя пенсіі, льготнае забесьпячэньне прадуктамі, медыкаментамі, санаторнае лячэньне і інш./.

Патрабаваць аднаўленьня ўсіх народных і гістарычных назваў гарадоў, вёсак, мястэчак, урочышч, вуліц, плошчаў, паркаў і сквераў, палітычных падзей, і т.п., перайменаваных альбо забароненых у часы сталіншчыны. Патрабаваць вяртаньня нацыянальнага правапісу беларускай мовы, скалечанага ў 30-х гадах. Патрабаваць адмены ўсіх геаграфічных, тапаграфічных і адміністратыўных назваў, зьвязаных са Сталіным і яго акружэньнем. Патрабаваць зьняцця мемарыяльных дошчак і дэмантажу помнікаў, пастаўленых асобам з сталінскага асяродзьдзя.

Падтрымліваць ідэі і спрыяць арганізацыі грамадскага і маладзёжнага руху "Курапаты", накіраванага на выяўленьне месцаў зьнішчэньня і пахаваньня ахвяр сталіншчыны; на высьвятленьне імён забітых і іх забойцаў.

Праводзіць работу ў кантакце з усімі зацікаўленымі савецкімі, дзяржаўнымі і партыйнымі органамі, з прагрэсіўнымі і патрыятычнымі

Патрабаваць афіцыйна прызнаць гістарычныя сімволікі і геральдыкі;

суполкамі, са студэнцкімі і школьнымі групамі пошуку.

Абменьвацца неабходнай інфармацыяй і супрацоўнічаць з аналагічнымі камітэтамі іншых саюзных рэспублік. Спрыяць утварэньню канфедэрацый такіх камітэтаў, таварыстваў і аб"яднаньняў; імкнуцца да стварэньня Усесаюзнай Канфедэрацыі нацыянальных таварыстваў памяці ахвяр сталінізму.

Першага лістапада 1987 года, напярэдадні традыцыйнага народнага Дня памінаньня памерлых продкаў -- "Дзяды", адбудзецца ў Менску першы на Беларусі мітынг, пасьвечаны памяці ахвяраў сталінскага генацыду. "Дзяды", Дзень Задушны, прыпадаюць на 2-га лістапада. Камітэт "58" далучаецца да гістарычнай традыцыі нашай культуры і адзначае дні 1 і 2 лістапада, як дні Памяці Народа. 1-га лістапада -- Грамадскае памінаньне. 2-га лістапада -- Абходы; наведаньне пахаваньняў і магіл.

Камітэт "58" будзе хадайнічаць перад Прэзідыумам Вярхоўнага Савета БССР аб афіцыйным прызнаньні 1-га і 2-га лістапада Днямі Памяці Народа на Беларусі.

Няхай же ўся наша праца зыходзіць з прынцыпаў гуманізму і найвышэйшай гістарычнай справядлівасьці: ніхто не забыты, нішто не забыта. Аднаўленьне памяці і справядлівасьці ў дачыненьні да ахвяр беззаконнасьці -- наш палітычны і маральны абавязак.

Арганізацыйная група -- Камітэт "58".